УДК 801.312.1(476)
**КРУПЕНІЧ К.А.,** студэнт
Навуковы кіраўнік **ЧАРНЯЕВА Т.В.**, старшы выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# ЗАОНІМЫ Ў МЯСЦОВЫХ НАЗВАХ РАСЛІН

Лексіка флоры адносіцца да найстаражытнейшых пластоў лексічнага фонду любой мовы. У ёй адлюстравана ступень практычнага і культурнага асваення чалавекам навакольнага асяроддзя.

Фларыстычная лексіка вылучаецца разнастайнасцю матываў і спосабаў намінацыі раслін, арыентаваных на вызначэнне ўласцівасцей самога аб'екта: лекавыя, смакавыя, колеравыя і г.д.

Аб'ектам даследавання з'явіліся мясцовыя назвы раслін (69 адзінак), выбраныя са слоўніка "Биологическая терминология и номенклатура: Словарь русско-белорусско-латинский, белорусско-русский", якія маюць у сваёй структуры заонімы.

Мэтай дадзенага даследавання быў комплексны аналіз названых адзінак у структурным, словаўтваральным і семантычным аспектах.

У якасці асноўных метадаў даследавання прымяняліся аналітычны і элементы статыстычнага.

У структурным і словаўтваральным аспектах вызначана наступная спецыфічнасць даследуемых адзінак: сярод мясцовых назваў пераважаюць двухкампанентныя (58% ад агульнай колькасці), утвораныя па мадэлі "прыметнік+назоўнік" *(заячы кроп, валоўі язык, зубрава трава)*. Сярод аднакампанентных назваў 44% утвораны лексіка-семантычным спосабам *(коцікі, коткі, ваўчкі)*, 31% – суфіксальным *(баброўнік, тураўка, сабачнік)*, 25% – складаннем *(мышабой, кацялапкі, казарост)*.

Большасць даследаваных назваў раслін утвораны па семантычнай мадэлі "заонім + фітонім": *кашэчая трава, заячае шчаўе, мядзведжая ягада, воўчая крапіва, зязюльчын лён і інш.* У частцы гэтых назваў дадзеная мадэль указвае на назіральнасць народа, якая праяўляецца ў называнні фітоніма імем жывёлы, якая прымяняе дадзеную расліну ў лекавых мэтах: *маралавы корань, кашэчы сардэчнік.*

Таксама вялікая колькасць фітонімаў утворана па мадэлі "заонім + саматызм": *сабачы язык, вароніны вочкі, бацяновы ножкі, мядзведжае вушка і інш.* Гэтыя назвы адлюстроўваюць асацыятыўныя сувязі носьбітаў мовы, таму што ў аснову наймення пакладзена параўнанне, прыпадабненне да якой-небудзь часткі цела жывёлы. Большасць падобных назваў утворана ў адпаведнасці з такім матывам намінацыі, як форма.

Вызначаны наступныя спецыфічныя асаблівасці назваў раслін з кампанентамі-заонімамі:

1) пераважаюць заонімы, якія называюць дзікіх жывёл;

2) у аснову мясцовай намінацыі многіх раслін пакладзена падабенства іх частак да частак цела жывёл.

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ